5. Tourism at World Heritage Sites – Challenges and Opportunities : International tourism seminar, Çeçme (Izmir), Turkey, 26 March 2013. – 81 p.

УДК 338.488:351.853

Т. С. Супранкова,
*старшы выкладчык кафедры культуралогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,*
*Мінск, Беларусь*

## КУЛЬТУРНАЯ БЯСПЕКА АДУКАЦЫЙНАГА ТУРЫЗМУ

Сфера турызму з'яўляецца важным аспектам поля даследавання культурнай бяспекі. Турызм звязаны з арганізацыяй паездак і падарожжаў за межы месца жыхарства, гэта актыўны від адпачынку, які прадугледжвае змену дзейнасці і абставінаў, магчымасць пазнаёміцца з культурай іншых краін і рэгіёнаў, духоўна ўзбагаціцца і сумясціць адпачынак з пазнаннем новага. Турызм таксама цесна звязаны з эканомікай краіны. «Индустрия туризма способствует притоку в страну финансовых ресурсов. Она не только дает доходы туристским фирмам, но и обеспечивает налоговые поступления, увеличивает спрос на продукты питания и разнообразные услуги, стимулируя тем самым развитие сопутствующих отраслей (транспорта, гостиничного хозяйства, связи, торговли и общественного питания, производства сувениров и т. п.). Обслуживание туристов – это источник доходов для местного населения. Данный вид деятельности не требует крупных стартовых инвестиций, отличается высоким уровнем рентабельности и относительно небольшим сроком окупаемости капитальных вложений. Развитие туризма способствует созданию новых рабочих мест и обеспечивает занятость населения (зарубежный опыт свидетельствует, что для обслуживания одного иностранного туриста требуется до 10 чел.)» [5].

Развіццё сферы турызму павышае сацыяльна-культурны ўзровень клопату пра насельніцтва, павялічвае рэсурсы для ўдасканалення інфраструктуры. Паляпшаецца якасць жыцця, узрастае прэстыж дзяржавы як на сусветнай арэне, так і сярод яе грамадзян. Важная функцыя турызму – умацаванне між-

культурных сувязей, дыялог з іншымі культурамі, міжкультурная камунікацыя. Узровень развіцця турызму сведчыць аб матэрыяльным дастатку і каштоўнасных арыенцірах грамадства.

Турызм спрыяе захаванню і падтрымцы помнікаў культуры, народных традыцый, мастацтва і культурных ініцыятыў, сферы культуры ў цэлым. Развіццё турызму таксама накіравана на ўздым нацыянальнай бяспекі праз рост культурнай самасвядомасці, таму з'яўляецца маркерам у вызначэнні культурнай бяспекі краіны, паколькі, на думку С. Фореста, «культурная безопасность, это скорее не защита культуры от угроз, а создание условий, при которых культура будет безопасно расти и развиваться по своим законам» [6].

Тым не менш ва ўмовах глабалізацыі, як адзначае С. В. Снапкоўская, «вызовы и угрозы в сфере культурных отношений, механизмов и систем заключаются в частичной утрате культурного наследия, в процессе глобализации культуры, выраженном нарастающим конфликтом традиционных и инновационных культурных форм, проблематичной этнокультурной, религиозной, а также экологической ситуации.

Очевидной становится ситуация, констатирующая снижение и культурного, нравственного, интеллектуального уровня целого ряда социальных слоев. В условиях глобализации культурная безопасность все больше становится основанием и важнейшим ресурсом для развития культурной идентичности» [4].

Таму задачы, якія стаяць перад сферай турызму, цесна звязаны з рашэннем праблем культурнай і нацыянальнай бяспекі. Найважнейшым тут выступае развіццё адукацыйнага (экскурсійнага) турызму, які ажыццяўляе падарожжы з пазнавальнымі мэтамі, а таксама культурнага турызму, задача якога – наведванне месцаў культурна-гістарычнай спадчыны і помнікаў культуры, а таксама месцаў правядзення культурна-забаўляльных мерапрыемстваў. Гэта лепшы спосаб пазнаёміцца з сусветнай культурай, паколькі кожная краіна і кожны народ маюць непаўторную культурную спадчыну, што з'яўляецца здабыткам усяго чалавецтва, духоўна ўзбагачае і спрыяе захаванню культурнай ідэнтычнасці. Культурная спадчына народа – гэта творы мастакоў, архітэктараў, музыкаў, пісьменнікаў, навукоўцаў, майстроў народнай творчасці і інш. Культура складаецца з матэрыяльных і нематэрыяльных каштоўнасцей, звычаяў, традыцый, важнай яе часткай з'яўляецца і

мова. Музеі, тэатры, запаведнікі, важныя гістарычныя месцы, помнікі гісторыі і архітэктуры, фестывалі і сімпозіумы, аб’екты рэлігійнага культу, бібліятэкі – усё гэта прадмет вывучэння культурнага і адукацыйнага турызму.

Навукова-адукацыйны турызм – дастаткова новы від міжнароднага турызму, што разглядае турыстычныя паездкі як сродак правядзення навуковай працы, навучання або павышэння кваліфікацыі. Да гэтага віду турызму можна аднесці навукова-даследчыя экспедыцыі, навуковыя сімпозіумы і канферэнцыі, паездкі для вывучэння замежнай мовы. Э. А. Лунін лічыць, што «адукацыйны турызм» цесна звязаны з «пазнавальным» і «культурным» і з’яўляецца вытворным ад іх [2].

Даследчык Т. Панамарова вызначае «адукацыйны турызм» як паездку або тур з адукацыйнай мэтай. «Кроме того, излишне упоминается авторами некоторых дефиниций временной промежуток, отведенный для образовательной цели поездки, поскольку туристом или путешественником считается лицо, находящееся в посещаемом месте (стране) не более одного года. Таким образом, если срок поездки превышает один год, то с точки зрения туризма лицо будет считаться мигрантом или постоянным жителем, а не туристом. Устанавливая период “от 24 часов до 6 месяцев” или “от 15 дней до 3 месяцев”, авторы лишь заостряют внимание на срочности получения образования, что, в сущности, не имеет для понятия “образовательный туризм” особого значения» [3].

На думку А. Агеевай, апошнім часам найбольш папулярнымі сталі наступныя віды адукацыйнага турызму:

– вучэбныя паездкі з мэтай вывучэння замежнай мовы альбо тых ці іншых агульнаадукацыйных або спецыяльных прадметаў;

– азнаямленчыя паездкі ва ўстановы, арганізацыі і прадпрыемствы;

– навуковыя і навучальныя стажыроўкі ва ўстановах, арганізацыях і на прадпрыемствах;

– удзел у семінарах, канферэнцыях, з’ездах, кангрэсах, творчых майстэрнях і майстар-класах, мэта якіх абмен вопытам і атрыманне новай прафесійна важнай інфармацыі;

– экскурсійна-азнаямленчыя падарожжы па розных гарадах, прыродных зонах і краінах [1].

Навукова-адукацыйны турызм, безумоўна, спрыяе паглыбленаму знаёмству з культурай краіны вывучаемай мовы і прак-

тыцы вуснага маўлення. На жаль, вопыт айчынных УВА сведчыць аб тым, што не ўсе студэнты маюць магчымасць выйграць грант і паехаць на стажыроўку на працяглы тэрмін. Адукацыйны турызм дае гэту магчымасць, паколькі асноўная катэгорыя ўдзельнікаў такіх тураў – студэнты і выкладчыкі; такім чынам, дадзеныя паездкі належаць да сацыяльнага турызму, які субсідзіруецца са сродкаў, што выдзяляюцца на сацыяльныя патрэбы ў мэтах стварэння ўмоў для турызму пэўных катэгорый грамадзян. Субсідыі выдзяляюцца як з дзяржаўных, так і з недзяржаўных фондаў, а таксама ад дабрачынных арганізацый. Таксама гэты від турызму прадугледжвае візавую падтрымку з боку пасольстваў замежных дзяржаў па запыце УВА, з якімі вядзецца супрацоўніцтва. У межах адукацыйных паездак таксама плануюцца навуковыя семінары і сустрэчы з калегамі з іншых краін. Часта студэнты самі прымаюць актыўны ўдзел у навуковых семінарах і рыхтуюць прэзентацыі ўніверсітэта і спецыяльнасцей.

Замежныя адукацыйныя туры з’яўляюцца відам арганізаванага турызму і прадугледжваюць загадзя распрацаваную і арганізаваную турыстычнай фірмай праграму падарожжа для кліентаў, згодна з іх пажаданнямі і бюджэтам. Турыстычная фірма загадзя браніруе і аплачвае ўсе паслугі па маршруце, афармляе неабходныя выязныя дакументы. Наведванне навучальных устаноў – абавязковая ўмова арганізаванай навукова-адукацыйнай паездкі, паколькі вывучэнне спецыфікі адукацыйных устаноў, абмен вопытам, завязванне кантактаў дапамагаюць лепш зразумець менталітэт народаў, культуру і мову якіх вывучаюць студэнты. Таксама, безумоўна, гэта спрыяе і ўсведамленню каштоўнасцей айчыннай культуры, што непасрэдна з’яўляецца спрыяльным фактарам для развіцця культурнай бяспекі.

На практыцы навукова-адукацыйны турызм цесна звязаны з экскурсійным і культурным, паколькі ўключае ў сябе паездкі з мэтай азнаямлення з гісторыка-культурнымі славутасцямі, музеямі, тэатрамі, традыцыямі народаў краіны наведвання. Таксама ён непарыўна звязаны з рэлігійным турызмам экскурсійна-пазнавальнай накіраванасці, паколькі ставіць перад сабой задачу пазнаёміць турыстаў з культавымі помнікамі культурнай спадчыны краіны наведвання.

Часта адукацыйныя туры могуць быць распрацаваны намаганнямі саміх студэнтаў і выкладчыкаў. Тады мы маем справу з неарганізаваным турызмам, які прадугледжвае, што турысты самі, без удзелу або пасрэдніцтва турыстычнай фірмы, арганізоўваюць падарожжа, самастойна распрацоўваюць маршрут паездкі, вызначаюць аб'екты экскурсійнага наведвання, плануюць месцы начлегаў, афармляюць выязныя дакументы і г. д. Неарганізаваны турызм у свеце вельмі папулярны, асабліва сярод моладзі.

Навукова-адукацыйны турызм мае вялікае значэнне ў працэсе міжкультурнай камунікацыі, таму што спрыяе абмену і перадачы інфармацыі ад адной культуры да іншай. Гэта адбываецца як на міжасобасным узроўні, так і на міжгрупавым, прафесійным і міжкультурным, з дапамогай вербальных і невербальных сродкаў перадачы інфармацыі. Несумненна, гэта таксама вядзе да разумення і асэнсавання ключавых задач культурнай бяспекі.


1. *Агеева, О. А.* Управление развитием образовательного туризма в России / О. А. Агеева // Инновации и инвестиции. – 2011. – № 3. – С. 201–205.

2. *Лунин, Э. А.* Совершенствование управления образовательным туризмом в РФ : автореф. дис. … канд. экон. наук : 08.00.05 / Э. А. Лунин. – СПб. : С.-Петерб. гос. ун-т, 2009. – 156 с.

3. *Пономарева, Т. В.* Образовательный туризм: сущность, цели и основные сегменты потребителей / Т. В. Пономарева // Проблемы современной экономики : сб. материалов IV Междунар. науч. конф., г. Челябинск, февр. 2015 г. – Челябинск, 2015. – С. 139–142.

4. *Снапковская, С. В.* Культурная безопасность как важный элемент сохранения идентичности в условиях глобализации / С. В. Снапковская // Кросс-культурное образование в условиях глобализации: теоретическое осмысление и национальные практики реализации : сб. науч. ст. / отв. за вып.: Л. В. Пироженко, И. Л. Шевлякова-Борзенко ; Мультикультурный исследовательский центр Университета Хучжоу, г. Хучжоу (КНР). – Псков, 2023. – С. 271–281.

5. Туризм [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://svastour.ru/articles/puteshestviya/vidy-turov/turizm.html. – Дата доступа: 27.02.2023.

6. *Forrest, S.* Indigenous Identity as a Strategy of Cultural Security [Electronic resource] / S. Forrest // Northern Research Forum. Plenary on Security. Yellow knife, NWT September 18, 2004. – Mode of access: http://scottforrest.pbworks.com/f/nrf2004.pdf. – Date of access: 27.02.2023.